тю (комплименты, употребление статусно-ориентированных слов); разъяснения (комментарии); *телезритель* реализует стратегии запроса информации, самовыражения и аргументирования посредством своих вопросов, отправленных в прямом эфире или в блог. Приглашенный в студию гость реализует основную семантическую стратегию информирования (т. е. ответы на вопросы), а также ряд дополнительных прагматических стратегий самовыражения (самопрезентации), создание имиджа.

Выявленные стратегии входят в число экстралингвистических признаков интерактивной телебеседы как жанра теледискурса, а тактики являются дифференциальными признаками, отличающими интерактивную телебеседу от других жанров теледискурса.

Литература

1. Дыя@блог P.S. / Нац. дзярж. тэлерадыёкампанія Рэсп. Беларусь, тэлеканал Беларусь 3. – Минск, 2015. – Режим доступа: http://sivecchircova.blogspot.com.by/p/blog-page.html. – Дата доступа: 10.01.2016.
2. Ларина, Е. Г. Лингвопрагматические особенности ток-шоу как жанра телевизионного дискурса (на материале американских телевизионных программ) : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 – Германские языки / Е. Г. Ларина. – Волгоград, 2004. – 22 с.
3. Лавренко, Е. В. Языковое воплощение коммуникативных стратегий в экономическом дискурсе (на материале британского и американского вариантов английского языка) : дис. … канд. филол. наук : 10.02.04 / Е. В. Лавренко. – Минск, 2008. – 120 л.
4. Иссерс, О. С. Коммуникативные стратегии и тактики русской речи / О. С. Иссерс. – 4-е изд. – М. : УРСС, 2006. – 288 с.

## ЦІ ВЕРУ Я Ў САЦЫЯЛЬНЫ ПРАГРЭС

**М. В. Кліменка**

*United World College Red Cross Nordic*, *Flekke, Нарвегія*

Навуковы кіраўнік А. Ю. Савенка, канд. філас. навук, дац.

У пачатку XX ст. дыктар амерыканскай радыёстанцыі сказаў, што на свеце ўсё ўжо вынайдзена і што далей рухацца няма куды. А наперадзе яшчэ былі камп’ютары, інтэрнэт, касмічныя ракеты, смартфоны… За апошнія гады шмат чаго змянілася на нашым свеце. Каб не заблытацца ў крутавароце гэтых змен і разабрацца ў руху чалавецтва, я разгледзеў бы прагрэс з некалькіх бакоў. Бо ён можа быць навукова-тэхнічным, сацыяльным і нават уласным, духоўным.

Я ніколькі не сумняваюся ў навукова-тэхнічным прагрэсе. Як бы ні быў задаволены чалавек, яго дапытлівасць, інтарэс, прагнасць і жаданне большага, пэўная, як пісаў Б. Аўэрбах, «незадаволенасць» будуць рухаць навуку і тэхніку наперад. Чым большая наша лянота, тым больш мы будзем жадаць. Шмат чаго новага з’явіцца гадоў праз 50. А ўявіць наша грамадства праз 2000 гадоў будзе, напэўна, гэтак жа складана, як адкрыць краі космасу. Вялікі шлях пройдзены ад пячорнага агню да лазераў, але пройдуць стагоддзі – і лазер будзе лічыцца не больш складаным за агонь.

Развіццё сувязі дазваляе нам быць у курсе ўсіх з’яў, што можа выклікаць памылковае пачуццё рэгрэсу. Сучаснае тэлебачанне, інтэрнэт распаўсюджваюць інфармацыю пра забойствы, тэракты, крызісы, прадказваюць катаклізмы. Але ці менш было розных выпадкаў у мінулым? Ці былі людзі больш гуманнымі? Яшчэ стагоддзе таму мы, здаецца, жылі б спакайней, таму што не ведалі б пра цунамі ў Японіі, пра дзяцей, якія галадаюць у Афрыцы, нават пра тое, што здарылася ў суседнім горадзе. Зараз увесь негатыў выліваецца на нас праз тэлебачанне і інтэрнэт і некаторым здаецца, што свет на грані катастрофы. Але і гэтая сверхдасведчанасць – і ёсць прагрэс. Сёння мы чуем пра ўсе праблемы, баімся, абураемся, потым выказваем сваю пазіцыю. А заўтра мы гэтыя праблемы вырашаем.

Здаецца, не павінна ўзнікаць ніякіх сумненняў наконт хуткага руху грамадства наперад. Але нешта тут не так… Мы забываем пра яшчэ адзін прагрэс – прагрэс маральны, ўнутраны. Я пакуль не веру ў яго, бо лічу, што мы яшчэ не дараслі да тых тэхналогій, якімі завалодалі за апошнія некалькі гадоў. Або проста не навучыліся карыстацца вынаходствамі максімальна эфектыўна. Мы зрабіліся спажыўцамі таго, што нам дае тэхнічны прагрэс.

Сёння мы жывём на дабаўках, кансервантах, зарастаем тлушчам, як кабанчыкі. Мы запаўняем сябе ежай толькі таму, што гэта модна і «крута». Мы прывыклі не рухацца, мы прывыклі не працаваць: усё за нас зробяць машыны. І з-за гэтага мы становімся больш хваравітымі, больш лянівымі, больш запускаем сябе.

Мы не самастойныя. Цяжка заўважыць, але мы залежым ад рэчаў, якія глытаем так, як і ежу. Не абысціся нам без моднай адзежы, новых прыладаў, нават пластыкавых пакетаў. Кажуць, што і адзежа, і апаратура робяцца спецыяльна недаўгавечнымі, каб вымусіць нас купляць. Людзі бяруць крэдыты, толькі каб набыць тэлефон, або тэлевізар, або прынтар з новай функцыяй. Але штодзённа мы выкідваем тоны паперы, пакетаў, іншых адходаў. Мы тонем у акіяне сваіх рэчаў і паступова разводзім вакол вялікую брудную свалку. Каробкі з-пад піцы, бутэлькі, недакуркі, чэкі – гэта нашы сучасныя нацюрморты.

Наша жыццё спрашчаецца. Нават мастацтва: музыка, кіно – стала тым, што можна купіць і праглынуць, атрымаўшы толькі вострыя пачуцці. Гаджэты, якія павінны паскараць наша жыццё, забіраюць наш час, нашы душы. Як мухі да лямпы, мы імкнёмся да экрана тэлевізара, які падпарадкоўвае нас, забірае нашу індывідуальнасць, рабуе нашу мову. Усё наша жыццё стала прымітыўным, матэрыяльным. Здаецца, сучасны чалавек звык да ўсяго гатовага і, страціўшы здольнасць думаць, дзейнічаць і тварыць, пасіўна плыве ў вялікім патоку. Куды мы рухаемся і што нас чакае?

Нават доступ да ведаў, шырыня рэсурсаў і магчымасцей вучыцца ніколькі не ацэнена, а адукацыя ўспрымаецца як нешта, што таксама можна купіць і праглынуць, як пачак чыпсаў. Сёння моладзь не ведае, што жадае вывучаць, а толькі думае пра тое, як лягчэй дайсці да паперкі, якая называецца дыпломам.

Мы аслеплены нашымі дасягненнямі ў навуцы, таму забываем, што прагрэс заключаецца ў кожным з нас. Мы павінны пастаянна ўдасканальвацца. Кожны дзень павінны разумець, што перайшлі на новую ступеньку свайго развіцця, сталі больш вопытнымі, зрабілі больш добрага. Каб быць шчаслівым, трэба ўмець паставіць мэту, ісці да сваёй мары, тварыць. Калі чалавек спыняецца, то загнівае. Як казаў Сэмюэл Джонсан, «Жыць – значыць пастаянна рухацца наперад».

Нягледзячы на прагрэс ў навуцы, наш маральна-этычны і духоўны бок не дасягнуў гэтага ж узроўню. Я спадзяюся, што гэтак адбываецца толькі таму, што мы яшчэ не паспелі дагнаць навукова-тэхнічную рэвалюцыю. Але я веру, веру, што калі-небудзь скончацца ўсе магчымыя дабаўкі да чыпсаў, скончацца ўсе магчымыя сюжэты прымітыўных тэлеперадач, што нам надакучыць спажываць, што прыйдзе час, калі мы будзем перасычаны ўсім гэтым і пачнем цаніць вечнае, духоўнае.

Літаратура

1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч // Беларуская Палічка – беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступу: http://knihi.com/Ihnat_Kanceuski/Adviecnym_slacham.html. – Дата доступу: 25.05.2016.
2. Філасофія : вучэб. дапам. / пад агул. рэд. А. С. Цернавога. – Мінск : НКФ «Экаперспектыва», 1996. – 383 с.
3. Философия истории: антология / сост., ред. и вступ. ст. Ю. А. Кимелева. – М. : Аспект Пресс, 1995. – 351 с.